


## § 4. Напрамкі палітычнай геаграфіі і асновы геапалітыкі

***Успомніце.*** Якую інфармацыю вы можаце атрымаць з палітычнай карты свету? Якія формы кіравання і дзяржаўнага ладу ў сучасных краінах свету вы ведаеце? Што з'яўляецца аб'ектам вывучэння палітычнай геаграфіі? Якія асноўныя рысы палітыка-геаграфічнага становішча Рэспублікі Беларусь?

***Для чаго мы гэта вывучаем?*** Веды якіх вучэбных прадметаў вам сёння будуць неабходныя? Сферай дзейнасці якіх спецыялістаў з'яўляецца палітычная геаграфія? Якімі ведамі павінен валодаць сучасны спецыяліст у галіне геапалітыкі?

**Аб'екты і асноўныя напрамкі палітычнай геаграфіі.** Палітычная геаграфія з'яўляецца адным з важных напрамкаў сацыяльна-эканамічнай геаграфіі і знаходзіцца на стыку навук. Таму шэраг вучоных адводзіць ёй самастойную ролю ў геаграфіі.

Палітычная геаграфія ўзнікла ў канцы XVIII ст. як прыродазнаўчая навука, вывучала падзел свету на дзяржавы, іх тэрыторыю, узаемнае размяшчэнне, межы і тлумачыла палітычныя працэсы характарам прыродных умоў і ландшафтаў.


Мал. 18. Ш. Л. Мантэск'ё (1689–1755)

***Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў.*** Вядомы французскі асветнік Шарль Луі Мантэск'ё (мал. 18) лічыў, што форма дзяржаўнага кіравання і ладу абумоўленая кліматам і памерам краіны. Навуковец пісаў, што аптымальнай будзе форма дзяржаўнага

ладу, якая спалучае перавагі рэспубліканскага праўлення з сілай манархіі. Такой формай кіравання Мантэск'ё лічыў федэрацыю — прасторава адзіны саюз суверэнных рэспублік, здольны супраціўляцца ворагу і захоўваць свае памеры без страты дэмакратыі. Ці згодныя вы з Мантэск'ё? Аргументуйце сваё меркаванне.



Мал. 19. Ф. Ратцэль (1844–1904), аўтар працы «Палітычная геаграфія» (1897)

У канцы XIX ст. дзякуючы працам нямецкага географа Ф. Ратцэля (мал. 19) асаблівасці палітычнага ладу, унутранай і знешняй палітыкі розных дзяржаў пачынаюць вывучаць з улікам геаграфічнага становішча, геаграфічных умоў і культурна-гістарычных асаблівасцей.

З часам уяўленні пра прадмет палітычнай геаграфіі значна пашырыліся.

***Палітычная геаграфія*** — геаграфічная навука, якая вывучае прасторавую арганізацыю палітычнага жыцця грамадства і тэрытарыяльныя спалучэнні палітычных сіл.

З развіццём навукі пашырыўся і спіс аб'ектаў вывучэння палітычнай геаграфіі (мал. 20).

Асноўнай задачай палітычнай геаграфіі з'яўляецца характарыстыка прасторавай карціны палітычнага жыцця краіны і фактараў, якія яго абумоўліваюць.

Вялікая колькасць аб'ектаў прывяла да фарміравання некалькіх самастойных навуковых напрамкаў. Кожны з іх у цяперашні час дынамічна развіваецца (мал. 21).

**Палітыка-геаграфічнае становішча краіны.** Вывучэнне геаграфічнага становішча мае важнае значэнне і шырока выкарыстоўваецца ў геаграфіі. Вылучаюць

| **Аб'екты палітычнай геаграфіі** |
|---|
| Палітыка-геаграфічнае становішча |
| Дзяржаўныя межы |
| Дзяржаўная тэрыторыя |
| Насельніцтва тэрыторыі |
| Палітычная сфера грамадскага жыцця |

Мал. 20. Аб'екты палітычнай геаграфіі




Мал. 21. Асноўныя напрамкі палітычнай геаграфіі

фізіка-геаграфічнае, эканоміка-геаграфічнае, транспартна-геаграфічнае становішча. У палітычнай геаграфіі на першым месцы знаходзіцца палітыка-геаграфічнае становішча.

***Палітыка-геаграфічнае становішча (ПГС)*** — гэта становішча аб'екта (краіны, яе часткі, групы краін) у адносінах да іншых дзяржаў і іх груп як палітычных аб'ектаў.

Эканоміка-геаграфічнае становішча і палітыка-геаграфічнае становішча маюць шмат агульнага. Гэта тлумачыцца тым, што геаграфічнае становішча краіны ў адносінах да транспартных шляхоў, крыніц сыравіны, патокаў тавараў і паслуг, інтэграцыйных аб'яднанняў і г. д. будзе аказваць уплыў не толькі на эканамічную, але і палітычную сітуацыю ў краіне, і наадварот.

$П_1$

Палітыка-геаграфічнае становішча — комплекс зносін гэтай дзяржавы з іншымі краінамі і тэрыторыямі на трох узроўнях: лакальным, макрарэгіянальным і глабальным, дапоўненых эканамічнымі, гістарычнымі, этнічнымі, канфесійнымі, культурнымі сувязямі.

**Свет і Беларусь.** Палітыка-геаграфічнае становішча з'яўляецца вельмі важным для краіны, таму што вызначае яе месца ў свеце і ўплывае на эканоміку, нацыянальную бяспеку, культурныя сувязі праз зносіны з суседнімі і іншымі дзяржавамі. Якія асноўныя перавагі палітыка-геаграфічнага становішча Рэспублікі Беларусь?

**Дзяржаўныя межы і формы іх змены.** Дзяржаўныя межы ўяўляюць сабой асаблівы тып геаграфічных меж, які вывучае палітычная геаграфія. *Дзяржаўная мяжа* — гэта лінія на паверхні зямлі (сушы або воднай прасторы) і ўяўная вертыкальная паверхня з паветранай прасторай і нетрамі, якая вызначае межы тэрыторыі краіны і аддзяляе яе ад іншых дзяржаў і адкрытых мораў. У палітычнай геаграфіі існуе некалькі прыкмет вылучэння меж (мал. 22).

У выніку розных падзей дзяржаўныя межы змяняюцца. Гэта можа адбывацца ў мірных формах (мал. 23). Напрыклад, у выніку продажу Аляскі ў 1867 г. змяніліся дзяржаўныя межы Паўночна-Амерыканскіх Злучаных Штатаў і Расійскай імперыі. У 1944 г. Тувінская Народная Рэспубліка добраахвотна ўвайшла ў склад СССР. У выніку штучнага прырашчэння тэрыторыі сушы павялічылася плошча Нідэрландаў і змяніліся межы дзяржавы. Выхад Вялікага княства Фінляндскага са складу Расіі ў 1917 г. і Сінгапура са складу Малайзіі ў 1965 г. змяніў дзяржаўныя межы гэтых дзяржаў. Прыкладам змянення дзяржаўнай мяжы ў выніку міжнароднага рашэння з'яўляецца

$П_2$

| **Прыкметы вылучэння меж** | |
|---|---|
| **Прыродныя** | араграфічныя (горныя, раўнінныя) (напрыклад, Пірэнеі — франка-іспанская мяжа) |
| | водныя (рачныя, марскія, азёрныя) (напрыклад, р. Меконг — мяжа Лаоса і Тайланда, Вялікія азёры — ЗША і Канады) |
| **Марфалагічныя** | геаметрычныя (напрыклад, мяжа Алжыра і Лівіі) |
| | акраінамічныя (напрыклад, ЗША і Канада — па 49° пн. ш., Егіпет і Судан — па 22° пн. ш.) |
| **Гістарычныя і паслядоўнасць узнікнення** | каланіяльныя (напрыклад, граніцы ў межах Французскай Заходняй Афрыкі) |
| | посткаланіяльныя, пасляваенныя, постсацыялістычныя і інш. (напрыклад, мяжа Польшчы пасля Другой сусветнай вайны) |
| | «сталыя» этнакультурныя (напрыклад, мяжа Нарвегіі і Швецыі) |
| **Функцыянальныя** | бар'ерныя (раздзяляльныя) (аддзяленне адной краіны ад іншай пры дапамозе мяжы) |
| | кантактныя (злучальныя) (зближэнне краін, супрацоўніцтва, развіццё эканамічных і культурных сувязей) |

Мал. 22. Прыкметы вылучэння дзяржаўных меж




Мал. 23. Формы змены дзяржаўных меж

змяненне меж Індыі і Пакістана (падзел штата Кашмір у 1949 г.). Пасля аб'яднання ў 1990 г. Федэратыўнай Рэспублікі Германіі (ФРГ) і Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі (ГДР) змянілася дзяржаўная мяжа ФРГ (мал. 24).



Мал. 24. Тэрыторыя ФРГ пасля аб'яднання з ГДР

**Памежныя спрэчкі.** Адным з найбольш актуальных пытанняў палітычнай геаграфіі з'яўляецца вывучэнне тэрытарыяльных прэтэнзій, памежных спрэчак паміж дзяржавамі. Сярод іх вылучаюць чатыры асноўныя віды (мал. 24-1). Найбольш часта ў свеце адбываюцца *тэрытарыяльныя спрэчкі* па прычыне кантролю над пэўнай тэрыторыяй, прывабнай па нейкай прыкмеце.

Напрыклад, гісторыка-культурнай тэрытарыяльнай спрэчкай з'яўляюцца прэтэнзіі Ірландыі на Паўночную Ірландыю.

*Рэсурсныя памежныя спрэчкі* складаюць значную частку канфліктаў пры асваенні прыродных рэсурсаў на кантынентальным шэльфе (нафта, газ), пры недахопе водных рэсурсаў у засушлівых раёнах (напрыклад, Малі і Буркіна-Фасо, Турцыя і Сірыя). Для вырашэння такіх спрэчак прымаюць рашэнне аб сумесным выкарыстанні рэсурсаў (напрыклад, гідраэнергапатэнцыял ракі Парана паміж Бразіліяй і Парагваем) або вызначаюць сектары з дакладнымі межамі дзяржаў (напрыклад, падзел нафтагазавых рэсурсаў Паўночнага мора паміж прыбярэжнымі дзяржавамі).




Мал. 24-1. Віды памежных спрэчак

***Клуб знаўцаў-эканамікагеографаў.*** Адрозніваюць пазіцыйныя і функцыянальныя памежныя спрэчкі. *Пазіцыйныя памежныя спрэчкі* ўзнікаюць у выпадку супярэчнасцей у тлумачэнні дамоў аб правядзенні меж па прыродных рубяжах — рэках (усходні ўчастак расійска-кітайскай мяжы на рацэ Амур), азёрах (возера Чад паміж Нігерам і Чадам). *Функцыянальныя памежныя спрэчкі* сустракаюцца радзей і ўзнікаюць з прычыны прэтэнзій аднаго з бакоў да рэжыму функцыянавання мяжы, строгасці памежнага кантролю і мытнай палітыкі, якія ўстаноўленыя суседняй дзяржавай. У дадзенай сітуацыі спрэчка вядзецца не аб змене мяжы, а аб памежнай палітыцы суседняй дзяржавы.

Выкарыстоўваючы матэрыялы вучэбнага дапаможніка і палітычную карту свету, знайдзіце дзяржавы, паміж якімі існуюць памежныя канфлікты і тэрытарыяльныя спрэчкі.

**Прыкладная роля палітычнай геаграфіі.** Веды палітычнай геаграфіі маюць вельмі шырокі ахоп і выкарыстоўваюцца ў самых розных галінах. Да асноўных з іх варта аднесці змяненне адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўпарадкавання краіны; асаблівасці знешняй палітыкі; прычыны этнічных канфліктаў; геаграфія выбараў і г. д. Запатрабаванасць палітычнай геаграфіі шмат у чым залежыць ад геаграфічнай адукацыі і геаграфічнай культуры грамадства.

**Геапалітыка, месца ў сістэме навук.** Адным з асноўных напрамкаў палітычнай геаграфіі з'яўляецца геапалітыка. Геапалітыка з'явілася на мяжы XIX–XX стст. у выніку аналізу міжнародных зносін з выкарыстаннем геаграфічных ведаў.

***У свеце ўсё ўзаемазвязанае.*** Заснавальнікам геапалітыкі лічыцца Арыстоцель, які ўказваў на геапалітычную ролю астравоў і пісаў, што востраў Крыт па сваім становішчы прызначаны для дамінавання над Грэцыяй. Ці згодныя вы са сцвярджэннем Арыстоцеля? Прывядзіце аргументы за і супраць гэтага выказвання.

Адно з першых азначэнняў характарызавала геапалітыку як навуку пра геаграфічную абумоўленасць розных палітычных працэсаў. Шведскі географ Р. Чэлен (мал. 25) першым увёў паняцце «геапалітыка».



Мал. 25. Р. Чэлен (1864–1922), аўтар тэрміна «геапалітыка»

***Геапалітыка*** — раздзел палітычнай геаграфіі пра заканамернасці размеркавання сфер уплыву дзяржаў і міждзяржаўных аб'яднанняў, які вывучае залежнасць дзяржаўных дзеянняў ад уплыву геаграфічных фактараў на эканамічнае, палітычнае і сацыяльнае жыццё грамадства.

Асноўнымі паняццямі ў геапалітыцы выступаюць: прастора, баланс сіл, інтарэсы і экспансія. Кожнае паняцце дазваляе ацаніць дзяржаву па розных прыкметах (мал. 26).

**Прастора ў геапалітыцы.** У геапалітыцы галоўнае значэнне мае *кантроль над прасторай.*

Геапалітычнае поле — гэта прастора, якая кантралюецца дзяржавай.

Напрыклад, геапалітычным полем Францыі з'яўляюцца арэалы рассялення старажытных плямёнаў сучасных французаў — галаў, для Расіі — аддаленыя раёны




Мал. 26. Асноўныя паняцці геапалітыкі

Усходняй Сібіры і Далёкага Усходу, тэрыторыі былога СССР, нацыянальнасці якіх пражывалі ў некалькіх рэспубліках (напрыклад, рускія ў БССР, рускія ў Казахстане).

**Геапалітычныя фактары развіцця краіны і галоўныя геапалітычныя працэсы свету ў канцы XX — пачатку XXI ст.** З цягам гістарычных падзей змяняецца месца краіны ў геапалітычнай прасторы свету. Аднак яно будзе вызначацца шэрагам фактараў, якія дзейнічаюць пастаянна (мал. 27).

Эканамічна развітыя краіны і шэраг краін, якія развіваюцца, у цяперашні час імкнуцца заняць больш моцную пазіцыю ў свеце. Таму яны надаюць увагу найбольш




Мал. 27. Геапалітычныя фактары развіцця краіны

важным геапалітычным аспектам: долі сваёй краіны ў сусветным валавым прадукце; валоданню ракетна-ядзернай зброяй; удзелу ў асваенні космасу і інш.

У канцы XX — пачатку XXI ст. у свеце адбыліся падзеі, якія аказалі ўплыў на глабальную геапалітычную карціну свету і прывялі да ўзнікнення новых пагроз. Да ліку асноўных з іх адносяць: распад сацыялістычнай сістэмы гаспадарання, эканамічны і ваенна-палітычны прарыў Кітая ў глабальную эканоміку і геапалітыку, узброеныя канфлікты і ваенна-палітычныя крызісы на Блізкім Усходзе, нарошчванне маштабаў тэрарызму і інш. (мал. 27-1).

П$_6$

| **Галоўныя геапалітычныя працэсы ў свеце ў канцы XX — пачатку XXI ст.** |
|---|
| **1.** Распад у 1990-я гг. сацыялістычнай сістэмы гаспадарання і звязаныя з гэтым узброеныя канфлікты і геапалітычныя змены ў Еўропе і на постсавецкай прасторы (краіны Балтыі, Украіна, Малдова, Паўднёвы Каўказ, Цэнтральная Азія) |
| **2.** Завяршэнне фарміравання Еўрасаюза, які адыгрывае ўсё больш сур'ёзную геапалітычную і эканамічную ролю ў свеце |
| **3.** Пашырэнне зоны ваеннага блока НАТА за кошт краін Балтыі, Усходняй Еўропы і Балкан, прамы ўдзел узброеных кантынгентаў краін — удзельніц НАТА ў ваенных аперацыях за межамі блока (Балканы, Афганістан, Ірак, Паўночная Афрыка) у 1990–2000 гг. |
| **4.** Эканамічны і ваенна-палітычны прарыў Кітая ў сферы глабальнай эканомікі і геапалітыкі |
| **5.** Узброеныя канфлікты і ваенна-палітычныя крызісы на Блізкім Усходзе і ў Паўночнай Афрыцы |
| **6.** Павышэнне ваенна-палітычнай напружанасці вакол Афганістана і Ірана, якое стварае перадумовы для ўзнікнення небяспечных ачагоў нестабільнасці ў свеце |
| **7.** Павелічэнне маштабаў тэрарызму |

Мал. 27-1. Галоўныя геапалітычныя працэсы ў свеце ў канцы XX — пачатку XXI ст.

У сучасным свеце можна вылучыць асноўныя геапалітычныя цэнтры сілы: Расія, ЗША, Еўрапейскі саюз, Кітай, мусульманскі свет. Гэта глабальныя і рэгіянальныя геапалітычныя гульцы, уплыў якіх у сучасным свеце найбольш значны.

Выкарыстоўваючы матэрыялы вучэбнага дапаможніка і палітычную карту свету, знайдзіце і пакажыце асноўныя геапалітычныя цэнтры сілы ў свеце.

**Электаральная геаграфія.** Электаральная геаграфія з'яўляецца адным з найбольш традыцыйных напрамкаў палітычнай геаграфіі, які актыўна развіваецца.

***Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў.*** Гэты напрамак узнік у Францыі на пачатку XX ст. з працы А. Зігфрыда «Палітычны агляд захаду Францыі ў часы Трэцяй рэспублікі». У ёй аўтар

упершыню ўстанавіў заканамернасці паміж прыроднымі характарыстыкамі і вынікамі выбараў у заходняй частцы Францыі. Таму гістарычна электаральная геаграфія вывучала геаграфію выбараў і тэрытарыяльную расстаноўку палітычных сіл.

*Электаральная геаграфія* — напрамак палітычнай геаграфіі, які вывучае тэрытарыяльныя адрозненні ў палітычных перавагах выбаршчыкаў на выбарах і ўплыў эканамічных, рэлігійных, этнічных фактараў на іх вынікі.

У электаральнай геаграфіі вылучаюць *тры асноўныя раздзелы*. Першы вывучае геаграфію галасавання, другі — геаграфію фактараў галасавання, трэці — геаграфію прадстаўніцтва партый у выбарных органах улады. Геаграфія выбараў залежыць ад гісторыка-культурных і дэмаграфічных асаблівасцей тэрыторыі. На яе таксама ўплываюць сацыяльна-эканамічныя адрозненні паміж тэрыторыямі ў межах краіны.

Электаральная статыстыка па выбарчых акругах з'яўляецца вельмі важнай для ўсіх палітычных сіл у кантэксце свайго ўплыву ў краіне. Таму адным з важных вынікаў геаграфіі выбараў з'яўляецца іх картаграфаванне (мал. 28).




Мал. 28. Геаграфія вынікаў выбараў прэзідэнта ў Францыі, 2022 г. (другі раўнд галасавання)

**Падвядзём вынікі.** Палітычная геаграфія — геаграфічная навука, якая вывучае … . Палітыка-геаграфічнае становішча краіны характарызуецца наступнымі асаблівасцямі … . Дзяржаўныя межы (марскія і сухапутныя) аддзяляюць … . Асноўная частка дзяржаўных меж праходзіць па … . Геапалітыка з'яўляецца раздзелам палітычнай геаграфіі, які вывучае … . Геапалітычнымі фактарамі развіцця краіны з'яўляюцца: …, …, … . Электаральная геаграфія займаецца вывучэннем пераваг выбаршчыкаў і вынікаў выбараў.

***Праверым свае веды.*** 1. Пералічыце асноўныя напрамкі палітычнай геаграфіі. 2. Якія існуюць віды дзяржаўных меж? 3. Прывядзіце гістарычныя прыклады змены дзяржаўных меж.

4. Хто ўвёў у навуковы ўжытак паняцце «геапалітыка»? 5. Якое значэнне мае электаральная геаграфія для сучасных палітычных працэсаў?

П$_7$

***Праверым свае веды.*** Чым выкліканыя памежныя спрэчкі паміж краінамі? Прывядзіце прыклады.

***Ад простага да складанага.*** 1. Якую ролю адыгралі натуральныя рубяжы (горы, рэкі, азёры) у фарміраванні палітычнай карты Еўропы (Азіі, Афрыкі, Амерыкі)? 2. Ці з'яўляюцца, на ваш погляд, геаграфічныя ўмовы галоўнымі для вызначэння шляхоў далейшага развіцця дзяржавы? 3. Чаму асваенне космасу з'яўляецца адной з прыярытэтных задач для Рэспублікі Беларусь?

***Ад тэорыі да практыкі.*** 1. Пакажыце краіны, межы якіх праходзяць па гарах; морах; пустынях; рэках. 2. Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, вызначце пяць краін з максімальнай плошчай тэрыторыі і пяць найбуйнейшых краін па колькасці насельніцтва. Параўнайце спісы гэтых дзвюх груп краін. Зрабіце вывад. 3. Прапануйце асноўныя напрамкі ўмацавання геапалітычнага становішча Рэспублікі Беларусь на 2026–2030 гг.

П$_8$

***Ад тэорыі да практыкі.***

Выканайце практычныя работы па тэме «Палітычная геаграфія і геапалітыка».

***Практычная работа 1.*** Параўнальная характарыстыка дзяржаўных меж і тэрыторыі дзвюх краін свету (на выбар).

***Практычная работа 2.*** Параўнальная характарыстыка палітыка-геаграфічнага становішча дзвюх краін свету (на выбар) па тыпавым плане.